# ГІСТОРЫЯ

УДК 338.43:636.084/089(476)(091) «1946/1991» DOI 10.63874/2218-0281-2026-1-5-12

***Мікалай Уладзіміравіч Смяховіч***
*д-р гіст. навук, дац., галоўны навук. супрацоўнік Інстытута гісторыі*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*
***Mikalai Smiakhovich***
*Doctor of Historical Sciences, Associat Professor,*
*Chef Researcher of Institute of History*
*of National Academy of Sciences of Belarus*
e-mail: smenic18@mail.ru

## КОРМАВЫТВОРЧАСЦЬ У КАЛГАСАХ І САЎГАСАХ БССР У 1946–1991 гг.: НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ, ВЫНІКІ

*Аналіз фактычнага матэрыялу паказаў, што ў 1946–1991 гг. вырашыць праблему забеспячэння жывёлагадоўчай галіны калгасаў і саўгасаў кармамі ў адпаведнасці з заатэхнічнымі нормамі ўлады БССР не здолелі. У артыкуле ўстаноўлена, што выкананню заданняў мэтавых праграм, скіраваных на вырашэнне кармавой праблемы, перашкаджалі формы кіравання гаспадаркамі, якія абапіраліся на бюракратызм, недахоп фінансавых і матэрыяльных рэсурсаў, недасканаласць тэхналагічнай базы кормавытворчасці.*

***Ключавыя словы:*** *БССР, калгас, саўгас, жывёлагадоўля, кормавытворчасць, урад, дырэктыва, праграма, фінансаванне, тэхналогія, вынік.*

## *Feed Production on Collective Farms and State Farms of the BSSR in 1946–1991: Directions of Development, Results*

*The results of analyzing the research material demonstrate that between 1946 and 1991 the authorities of the BSSR were unable to solve the problem of providing the livestock industry with feed in accordance with zootechnical standards. The article establishes that the fulfillment of the tasks of target programs aimed at solving the feed problem was hindered by bureaucratic forms of management, lack of financial and material resources, and imperfection of the technological base of feed production.*

***Key words:*** *BSSR, collective farm, state farm, livestock, feed production, government, directive, program, financing, technology, result.*

### Уводзіны

У беларускай гістарыяграфіі не назапашана прац па пытанні развіцця кормавытворчасці ў калгасах і саўгасах БССР. Некаторыя звесткі ўтрымліваюцца ў абагульняючых калектыўных манаграфічных працах. Спроба вырашэння кармавога пытання ў 1971–1991 гг. разглядалася У. Навіцкім у т. 6 «Гісторыі Беларусі» [1, с. 415–416]. Прац замежных аўтараў па гісторыі кормавытворчасці таксама няма.

Актуальнасць тэмы даследавання абумоўлена недастатковасцю яе гістарыяграфічнай распрацоўкі, неабходнасцю больш глыбокага і сістэмнага вывучэння прадмета даследавання.

Крыніцазнаўчую базу, на якую абапіраецца даследаванне, склалі рашэнні, якія прымаліся кіраўніцтвам КПСС – КПБ, дакументы, якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (Ф. 4п, Воп. 156; Ф. 7, Воп. 10; Ф. 30, Воп. 13; Ф. 31, Воп. 15; Ф. 48, Воп. 14).

Метады даследавання: аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, параўнанне і абагульненне; прынцыпы аб’ектыўнасці, гістарызму і сістэмнасці, уласцівыя дыялектычнаму матэрыялізму; гісторыка-параўнальны метад, гісторыка-генетычны метад, колькасны аналіз.

Мэтай артыкула з’яўляецца разгляд напрамкаў практычнай дзейнасці дзяржаўнага кіраўніцтва Савецкай Беларусі, кадравага складу аграрных прадпрыемстваў у вырашэнні кармавой праблемы.

Для дасягнення мэты неабходна было вырашыць наступныя задачы:

1) выявіць намаганні кіраўніцтва БССР у вырашэнні кармавога пытання;

2) вызначыць прычыны, якія перашкаджалі яго вырашэнню, даць ацэнку вынікам зробленага.

**Асноўная частка**

Адной з самых злабадзённых праблем сельскай гаспадаркі з'яўляўся недахоп кармоў, неабходных для ўтрымання жывёлы. Ад наяўнасці кармоў залежала выніковасць працы гаспадарак у вытворчасці малака і мяса.

У сакавіку 1946 г. быў прыняты чацвёрты пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі СССР. У плане адзначалася, што важнейшай задачай сельскай гаспадаркі БССР у 1946–1950 гг. было павелічэнне валавога збору сельскагаспадарчай прадукцыі.

У жывёлагадоўлі было запланавана давесці колькасць буйной рагатай жывёлы да 2,86 млн галоў, коней – да 0,77 млн, свіней – да 2,6 млн, авечак і коз – да 2,9 млн галоў [2, с. 24–26, 247–250]. Аднак ужо ў 1946 г. у БССР не быў выкананы гадавы план развіцця жывёлагадоўлі.

У калгасах па прычыне недахопу кармоў загінула 65,7 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы, 10 тыс. свіней, 38,9 тыс. авечак і коз [3, с. 197–198].

У цэлым у 1950 г. паказчыкі чацвёртай пяцігодкі, якія датычыліся сельскай гаспадаркі БССР, не былі выкананы. Сярод прычын, якія перашкаджалі выкананню планавых паказчыкаў, асноўнымі былі апора на прымусова-бюракратычныя формы гаспадарання, адсутнасць у гаспадарках фінансавых рэсурсаў, тэхнікі, неабходнай для кармавытворчасці, адсутнасць у калгаснікаў матывацыі да працоўнай дзейнасці. Асноўнай формай аплаты працы ў арцелі быў працадзень, які не матываваў калгаснікаў да працы. У 1946 г. у БССР 90 % калгасаў не выплачвалі калгаснікам ніякага заробку; у цэлым у гады чацвёртай пяцігодкі працадні не мелі ніякай рэальнай вартасці [4, с. 52]. У выніку ў гаспадарках становішча з нарыхтоўкай кармоў заставалася цяжкім. У зімовастойлавы перыяд 1952–1953 гг. у калгасах БССР загінула каля 27 тыс. галоў свойскай жывёлы [5, арк. 266].

Неабходна адзначыць, што ў 1947–1953 гг. дзяржавай па пытанні кормавытворчасці прымалася шмат рашэнняў, але яны па прычыне амаль поўнай адсутнасці корманарыхтоўчай тэхнікі, прымусу калгаснікаў да нарыхтоўкі сена рукамі слаба ўплывалі на справу. У 1953 г. першы сакратар ЦК КПБ М. Патолічаў канстатаваў, што грамадская жывёлагадоўля не забяспечваецца кармамі, ставілася задача ў бліжэйшыя гады «ліквідаваць запушчанасць кармавой базы», было запланавана нарыхтоўваць па 2,5 т бульбы, 5-6 т кукурузнага сіласу на карову, па 3–4 т бульбы на свінаматку [6, с. 486–487]. На працягу 1954–1957 гг. гэтыя паказчыкі не былі дасягнуты, таму ў 1958 г. першы сакратар ЦК КПБ (б) К. Мазураў зноў канстатаваў, што ў калгасах і саўгасах догляд жывёлы арганізаваны дрэнна [7, с. 132–134]. Ён адзначаў, што ў гаспадарках на становішчы спраў з кормавытворчасцю негатыўна адбіваўся недахоп кваліфікаваных кадраў, фінансавых рэсурсаў, кароўнікаў, цялятнікаў, памяшканняў для захоўвання кармоў.

Паводле разлікаў Дзяржплана БССР, у 1955–1960 гг. у калгасах і саўгасах было запланавана пабудаваць гаспадарчых памяшканняў, фермаў на 1,0 млн галоў буйной рагатай жывёлы, свінарнікаў – на 852 тыс. галоў з тым, каб да пачатку 1960 г. усё пагалоўе знаходзілася ў «добраўпарадкаваных памяшканнях» [8, арк. 30].

Пасля таго як у маі 1957 г. кіраўніцтва СССР абвясціла спаборніцтва з ЗША ў вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі на душу насельніцтва, пытанне забеспячэння жывёлагадоўлі кармамі абвастрылася: у гэты час адбыліся поўныя змены ў падыходах да яго вырашэння. Яны датычылі ініцыятывы, з якою кіраўніцтва ЦК КПСС звярнулася да беларускіх уладаў, кадравага корпусу аграрных прадпрыемстваў рэспублікі. Ужо ў студзені 1958 г. прагучаў заклік да вытворчасці кукурузы і цукровых буракоў, што для кіраўніцтва, калектываў беларускіх калгасаў і саўгасаў было справай новай і надзвычай нязвыклай.

Падчас наведвання БССР у 1958 г. на гэта звяртаў увагу беларускага кіраўніцтва першы сакратар ЦК КПСС М. Хрушчоў: «Я гаварыў раней і хачу паўтарыць цяпер: няма іншай культуры, якая так аплачвае працу, як кукуруза… Кукурузу ў Беларусі трэба сеяць… Я параіў бы Беларусі сеяць цукровыя буракі… Беларусь павінна ўзяцца за вырошчванне буракоў» [9, с. 12–13, 19].

Аднак матэрыяльныя рэсурсы, якія ў гэты час кіраўніцтва Савецкай дзяржавы ў прыярытэтным парадку напраўляла на засваенне цаліны, рэспубліцы на развіццё сельскай гаспадаркі з саюзных фондаў амаль не выдзяляліся. Таму беларускае партыйнае кіраўніцтва не мела магчымасці прыслухацца да парады і справай падтрымаць хрушчоўскую ініцыятыву. Пасля прыняцця трэцяй праграмы КПСС, калі савецкая прапаганда нястомна заклікала будаваць каму-

нізм, М. Хрушчоў у мэтах кантролю вырашыў наведаць Беларусь. 10 студзеня 1962 г. ён прыехаў у Мінск. «Цяпер і з вамі, таварышы беларусы, пагаворым па душах… Тры гады няма руху наперад… Уся справа ў вытворчасці кармоў… За мінулы год у калгасах і саўгасах рэспублікі загінула 516 тыс. свіней, або 15 % усяго пагалоўя, у т. л. 395 тыс. парасят, або 20 %. Гэта, што… нармальная з’ява?.. Не, гэта – абуральнае вядзенне сельскай гаспадаркі, вынік адсутнасці кармоў, дрэннага дагляду жывёлы», – канстатаваў М. Хрушчоў [8, с. 8–13]. Пасля гэтага беларускае кіраўніцтва, адчуваючы пагрозу кадравых перамен, узялося за справу: у рэспубліцы распачалася кампанія па пашырэнні пасеваў кукурузы, цукровых буракоў, іншых кармавых культур. Дзеля гэтага былі выдаткаваны фінансавыя сродкі, у сельскагаспадарчых ВНУ рыхтаваліся кадры, а ў сельскагаспадарчыя прадпрыемствы выраслі пастаўкі аўтатрактарнай тэхнікі: у 1959 г. сельская гаспадарка БССР атрымала 4,7 тыс. трактароў, а ў 1965 – 9,1 тыс. трактароў. У 1965 г. калгасы на набыццё машынна-трактарнай тэхнікі накіравалі 22 % грашовых сродкаў ад агульнага аб’ёму сваіх капіталаўкладанняў.

У 1965 г. у сярэднім на адзін беларускі калгас прыпадала 23 трактары ў пераліку на 15-сілавыя і 4 збожжаўборачныя камбайны [11, с. 15]. Механізацыя і спецыялізацыя вытворчасці спрыялі таму, што ў гады сямігодкі плошчы пасеву кукурузы і цукровых буракоў павялічыліся ў Гродзенскай, Мінскай, Брэсцкай і Гомельскай абласцях. Буракі і кукуруза добра «прыжыліся» на меліяраваных тарфяніках беларускага Палесся, што палепшыла становішча з нарыхтоўкай кармоў. Аднак паводле калгасных справаздач працэс спецыялізацыі не суправаджаўся працай па ўкараненні новых прагрэсіўных тэхналогій, мерапрыемствамі па забеспячэнні жывёлагадоўчых комплексаў кваліфікаванымі спецыялістамі, што тармазіла вырашэнне кармавога пытання.

Яшчэ адным фактарам, ад якога залежала становішча з кармамі, была вытворчасць камбініраваных кармоў.

У 1964 г. дэфіцыт камбікармавых рэсурсаў Савецкай дзяржавы склаў 2 млн т [12, арк. 31]. У сувязі з гэтым М. Хрушчоў заявіў: «Надышоў час стварыць прамысловасць па вырабе камбініраваных кармоў. У нас ёсць камбікармавыя заводы, але іх работа арганізавана па-саматужнаму… Нельга пакідаць камбікормавую прамысловасць на такім узроўні» [13, с. 53–54].

Пасля гэтага ў БССР шырокае распаўсюджванне атрымалі міжгаспадарчыя аб’яднанні па розных відах дзейнасці. Мінсельгас БССР кантраляваў справу, у лютым 1980 г. быў выдадзены загад «Аб становішчы і развіцці міжгаспадарчай кааперацыі сельскагаспадарчай вытворчасці і аграпрамысловай інтэграцыі ў рэспубліцы», у якім адзначалася, што функцыі міжгаспадарчых прадпрыемстваў ажыццяўлялі 277 калгасаў і саўгасаў, 186 – па абслугоўванні калгасаў і саўгасаў, у тым ліку ў нарыхтоўцы кармоў [14, арк. 93–94].

Разам з тым істотнай перашкодай з’яўляліся фармальна-бюракратычныя формы і метады кіравання гаспадаркамі, калі ў справаздачах старыя фермы многіх калгасаў і саўгасаў былі «пераўтвораны» ў комплексы. У выніку сродкі на іх мадэрнізацыю не выдзяляліся, а тэхналогіі заставаліся фізічна і маральна састарэлымі, таму 40 % тэхналагічных аперацый выконваліся даіндустрыяльнымі метадамі, што тармазіла як развіццё гаспадарак, так і вырашэнне кармавой праблемы. Па нашых падліках, у цэлым у 1985 г. працэс комплекснай механізацыі ахапіў у сярэднім прыкладна 70 % усіх тэхналагічных аперацый, якія выконваліся ў раслінаводстве і жывёлагадоўлі калгасаў і саўгасаў рэспублікі.

Адным з пытанняў, ад якога залежала рацыянальнае выкарыстанне кармоў, была іх структура ў рацыёне жывёлы. У 1970-х гг. беларускімі навукоўцамі было ўстаноўлена, што структура кармоў у рацыёне жывёлы павінна быць наступнай: канцэнтраваныя кармы – 25–30 %, зялёныя – 30–35 %, грубыя – 25–30 %, сакавітыя – 15–20 %. Пры гэтым доля высакаякаснага сена ў групе грубых кармоў павінна была складаць 6–10 % [15, с. 193]. У верасні 1970 г. была прынята чарговая пастанова ЦК КПБ і СМ БССР «Аб мерах па паляпшэнні якасці кармоў у 1971–1975 гг.», у якой прадугледжвалася павялічыць вытворчасць кармоў і іх якасць за кошт стварэння 1500 тыс. га высокапрадукцыйных лугоў і выганаў, і ў 1974 г. было створана 1497 тыс. га такіх лугоў [16, арк. 173].

Беларускімі навукоўцамі былі распрацаваны кармавыя балансы. Паводле іх на вытворчасць 1 ц мяса на адну ўмоўную галаву буйной рагатай жывёлы патрабавалася расходаваць 8,4 ц кармавых адзінак (карм. адз.); на вытворчасць 1 ц мяса свіней – 7,8 ц карм.

адз. на адну ўмоўную галаву; на вытворчасць 1 ц малака – 1,2 ц карм. адз. на адну ўмоўную галаву [17, арк. 1].

Аднак у 1970–1980 гг. кармавое пытанне вырашалася складана, перш за ўсё па прычыне недастатковай вытворчасці. У гэты перыяд вытворчасць кармоў была далёкай не толькі ад запланаваных пастановамі норм забеспячэння, але і ад рэальных гаспадарчых патрэб. У 1974–1975 гг. забяспечанасць грамадскага статку рэспублікі кармамі складала: па сене – 50,3 %, сенажы – 118,6 %, карняплодам – 48,9 %, бульбе – 122,7 % ц карм. адз. на адну ўмоўную галаву, што складала 85,9 % да разліковых заатэхнічных нормаў [17, арк. 196].

У 1975–1976 гг. забяспечанасць кармамі ў калгасах і саўгасах БССР у разліку на адну ўмоўную галаву знізілася да 66,7 % [17, арк. 196]. У 1975–1976 гг. забяспечанасць жывёлагадоўлі БССР канцэнтратамі ўласнай вытворчасці складала толькі 41,5 % [17, арк. 58].

Паводле планаў Мінсельгаса БССР, у 1975 г. для стварэння трывалай кармавой базы неабходна было ў кожнай гаспадарцы вырабляць на ўмоўную галаву 38 ц карм. адз. [18, арк. 22]. У 1976 г. спецыялістамі Мінсельгаса БССР была праведзена праверка ўтрымання жывёлы ў зімовы перыяд. Было ўстаноўлена, што ў пачатку лістапада большасць гаспадарак Брэсцкага, Пінскага, Кобрынскага, Бярозаўскага раёнаў па прычыне недахопу кармоў не перавяла буйную рагатую жывёлу на зімова-стойлавы перыяд кармлення [19, арк. 39]. Такое ж становішча склалася ў шмат якіх раёнах Віцебскай вобласці, «у абсалютнай большасці» гаспадарак Жлобінскага, Жыткавіцкага, Буда-Кашалеўскага раёнаў [19, арк. 43].

Становішча з кармамі не выправілася ў лепшы бок і надалей. У 1980–1981 гг. для вытворчасці зялёных кармоў выкарыстоўвалася 3,4 млн га сенакосаў і выганаў, больш за 2 млн га было засеяна кармавымі культурамі. Але кожны год запатрабаванасць у кармах задавальнялася «не больш чым на 70–75 %» [20, арк. 30]. Безумоўна, не ва ўсіх раёнах кіраўнікі калгасаў і саўгасаў дрэнна клапаціліся аб кармавой базе, былі і добрыя гаспадары. Так, у Слонімскім раёне вытворчасць кармавых адзінак з 1 га сельгасугоддзяў павялічылася з 17 ц у 1970 г. да 30 ц у 1979 г. Таму вытворчасць мяса ў гаспадарках гэтага раёна за 1976–1980 гг. павялічылася на 17 % і склала ў разліку на 100 га сельгасугоддзяў 154,5 ц, вытворчасць малака за гэты час павялічылася на 12,5 % і склала 481,8 ц на 100 га сельгасугоддзяў, рэнтабельнасць вытворчасці мяса буйной рагатай жывёлы ў 1979 г. у раёне склала 41,2 % [21, арк. 39–41].

У 1980 г. кіраўніцтвам Мінсельгаса БССР была пастаўлена задача давесці вытворчасць кармоў да 20,5 млн карм. адз., што дало б магчымасць атрымаць па 36 ц карм. адз. на ўмоўную галаву [21, арк. 47]. Аднак дасягнуць гэтага паказчыка гаспадаркі не здолелі. У 1984 г. у гаспадарках Слуцкага раёна на ўмоўную галаву прыпала 10,3 ц карм. адз., што склала 54 % да неабходнай нормы. У выніку сутачны надой малака ад каровы зімой 1981 г. у гэтым раёне склаў 4,6 кг (на 0,5 кг менш, чым у 1980 г.) [19, арк. 10]. Не лепшым было становішча ў іншых раёнах рэспублікі, таму ў чарговы раз Мінсельгас БССР выдаў загад аб нарыхтоўцы ва ўсіх гаспадарках рэспублікі 35 ц карм. адз. на адну ўмоўную галаву [23, арк. 27].

Нягледзячы на тое, што ў гаспадарках на ўмацаванне кармавой базы была нацэлена механізацыя кормавытворчасці, укараненне гасразліку ў брыгадах, якія займаліся нарыхтоўкай кармоў, становішча заставалася складаным. Кармоў пастаянна не хапала. Аналіз, праведзены спецыялістамі Мінсельгаса БССР, паказаў, што па прычыне недакорму жывёлы яе вытворчы патэнцыял у многіх гаспадарках выкарыстоўваўся меней чым на 70 % [24, арк. 5]. Назіралася натуральная ўзаемасувязь: кармоў выраблялася на 50–70 % да нормы, і вытворчы патэнцыял жывёлы выкарыстоўваўся на 50–70 % да яе генетычных магчымасцей.

Каб выправіць становішча, у 1981 г. кіраўніцтва БССР прыняло «Мэтавую праграму развіцця кормавыторчасці на XI пяцігодку». На падрыхтоўцы кармоў у гаспадарках было задзейнічана 20 тыс. чалавек, якія былі аб'яднаны ў механізаваныя брыгады і звёны, у 90 % гаспадарак працавалі спецыялісты па нарыхтоўцы кармоў.

У 1984 г. пасевы канюшыны, люцэрны і іх сумесі павялічыліся ў 1,4 разы, вырасла плошча пасеву кукурузы з 229 тыс. га ў 1981 г. да 386 тыс. га ў 1984 г. (на 35 %), плошча пасеву бабовых у структуры аднагадовых траў склала 67,1 %. У цэлым у 1984 г. з 1 га кармовых культур на ворыве было атрымана па 36,8 ц карм. адз. супраць 28,8 ц у 1981 г. (прырост склаў 28 %).

Але ў рэспубліцы прадукцыйнасць лугоў і выганаў заставалася слабой і не перавысіла 15–16 ц/га карм. адз., а на палепшаных – 18–20 ц/га карм. адз. [25, арк. 14–16].

Паводле праграмы было запланавана ў 1985 г. давесці вытворчасць кармоў да 24 млн т карм. адз. [24, арк. 37]. Выкананне заданняў гэтай праграмы кантраляваў Мінсельгас БССР. У 1982 г. міністэрства канстатавала, што недастатковы ўзровень кормавытворчасці стаў галоўнай перашкодай у далейшым нарошчванні вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі і рэалізацыі планавых заданняў. Недабор кармоў у 1984 г. склаў 9,4 млн карм. адз., ці 32 % да плана [26, арк. 15, 22].

Вынікі выканання заданняў мэтавай праграмы былі падведзены ў кастрычніку 1985 г., але яе асноўных паказчыкаў калгасы і саўгасы рэспублікі дасягнуць не здолелі. Таму ў красавіку 1985 г. у БССР калгасныя гаспадаркі пачалі набываць хлебабулачныя вырабы і карміць хлебам жывёлу, што шырока абмяркоўвалася ў грамадстве (гэтай справай займалася пракуратура СССР).

Калі ў нарыхтоўцы кармоў для буйной рагатай жывёлы значную ролю адыгрывалі грубыя і сакавітыя кармы, то ў свінагадоўлі асноўнымі былі канцэнтраты, якія выпрабляліся на прадпрыемствах перапрацоўчай прамысловасці, што ўваходзіла ў склад мукамольна-крупяной прамысловасці.

У 1970 г. доля камбікормавай падгаліны складала 11,6 %, а ў 1979 г. яна павялічылася да 29,2 % у агульным аб'ёме вытворчасці мукамольна-крупяной прамысловасці [27, арк. 164]. Аднак патрэбы ў камбікармах задавальняліся далёка не ў поўнай меры. Каб скараціць выдаткі дзяржавы, з гэтага часу было вырашана на аснове кааперацыі ствараць міжгаспадарчыя прадпрыемствы па вытворчасці кармоў. Акрамя таго, да ліку дапаможных галін міжгаспадарчай дзейнасці адносілася вытворчасць кармавых дабавак у хімічнай прамысловасці: мачавіны, кармавых драждэй, біяміцыну [27, арк. 160].

У 1970 г. у кармацэхах калгасаў і саўгасаў было выраблена 1637 тыс. т камбікармоў, а ў 1975 г. аб'ём вытворчасці склаў 3000 тыс. т [28, арк. 135] (рост на 48 %). Для вытворчасці камбікармоў ствараліся міжгаспадарчыя аб'яднанні. Гэта быў адзін з напрамкаў спецыялізацыі і канцэнтрацыі вытворчасці. Так, калі ў 1980 г. у рэспубліцы налічвалася 201 міжгаспадарчае аб'яднанне, куды на правах пайшчыкаў уваходзіла 3560 калгасаў і саўгасаў, то ў 1985 г. ужо дзейнічала 286 міжгаспадарчых аб'яднанняў (на 42,2 % больш), у складзе якіх налічвалася 5748 гаспадарак-пайшчыкаў (больш на 33,4 %) [29, арк. 135]. У асноўным гэта былі міжгаспадарчыя аб'яднанні па вытворчасці камбікармоў і кармавых дабавак, рамонце і абслугоўванні сельгастэхнікі, будаўніцтве. Аднак гэта не дапамагло вырашыць праблемы забеспячэння жывёлагадоўлі кармамі ўласнай вытворчасці. На гэтыя мэты, па разліках спецыялістаў, патрабавалася штогод напраўляць каля 3,5 млн т фуражнага збожжа, якога ў рэспубліцы не было.

Значную ролю ў вырашэнні кармавога пытання адыграла меліярацыя. У 1985 г. меліяраваныя землі меліся ў 85 % калгасных і саўгасных гаспадарак рэспублікі. На меліяраваных землях выраблялася 30 % прадукцыі раслінаводства, з іх 61 % складала гародніна і звыш 40 % кармы. Прадукцыйнасць кармавога кліна меліяраваных зямель склала каля 25 ц/га карм. адз., а ворыва – на ўзроўні 35–40 ц/га карм. азд. У рэспубліцы ў 1976–1980 гг. з меліяраваных зямель было атрымана 27 млн. т карм. адз., у 1,5 раза больш, чым у 1971–1975 гг. Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых на меліяраваных землях склала 24,7 ц/га, цукровых буракоў (фабрычных) – 224,4 ц/га, гародніны – 146 ц/га, бульбы – 159 ц/га. У цэлым у параўнанні з 1965 г. у рэспубліцы дзякуючы меліярацыі ўраджайнасць збожжавых павялічылася ў 1,5 раза, закупкі збожжа павялічыліся ў 6 разоў, малака, мяса, бульбы, гародніны – у 1,8–3,3 раза [30, с. 122–124].

У ліпені 1985 г. была прынята пастанова ЦК КПБ і СМ БССР «Аб асноўных напрамках развіцця вытворчасці кармоў у рэспубліцы на 1986–1990 гг.». У ёй адзначалася, што ў выніку ўкаранення гаспадарчага разліку і самастойнасці гаспадарак знізілася ўвага да прагрэсіўных корманарыхтоўчых тэхналогій. У пастанове былі вызначаны заданні па вытворчасці кармоў. Кіраўніцтву АПК, калгасаў і саўгасаў на аснове вывучэння вопыту калгасаў «Прагрэс» Гродзенскага, імя М. Урыцкага Гомельскага, імя 60-годдзя Кампартыі Беларусі Бярозаўскага, «Ленінскі шлях» Слуцкага раёнаў была пастаўлена задача палепшыць працу па ўкараненні інтэнсіўных тэхналогій у кормавытворчасці. Было запатрабавана, каб кожная гаспадарка на зімова-стойлавы перыяд нарыхтоўвала па 20 ц карм. адз., у т. л. уласнай вытворчасці 17,6 ц на ўмоўную галаву; акрамя таго, патрабавалася давесці ў 1990 г. расход кармоў на атрыманне 1 ц малака

не больш чым да 1,2 ц карм. адз., ялавічыны – да 10,6, свініны – да 7,6 ц карм. адз.

У мэтах кантролю за якасцю кармоў было прынята «Заданне» па стварэнні ў калгасах і саўгасах 2520 пунктаў аператыўнага кантролю. Выкананне ўсіх заданняў, вызначаных пастановай, павінна было прывесці «да поўнай забяспечанасці патрэб жывёлагадоўлі» кармамі ўласнай вытворчасці [28, арк. 115–116].

Але катастрофа на ЧАЭС не толькі не дазволіла выканаць намечанага – яна значна абвастрыла пытанне нарыхтоўкі кармоў, асабліва на забруджаных радыёнуклідамі тэрыторыях. У 1989 г. шмат якія гаспадаркі Шумілінскага, Талачынскага, Сенненскага, Ушацкага, Валожынскага, Клічаўскага, Бераставіцкага, Віцебскага, Глыбоцкага і шэрага іншых раёнаў пачалі зімовы стойлавы перыяд з 75 %-най забяспечанасцю кармамі. Гэта тлумачылася тым, што план вытворчасці фуражнага зерня, з якога выраблялася камбікорм, калгасамі і саўгасамі рэспублікі быў выкананы толькі на 53 % [31, арк. 117].

Каб знізіць дэфіцыт кармоў, былі прыняты дадатковыя меры па будаўніцтве цэхаў па вытворчасці камбікорму ў міжгасах. Гэта дазволіла павялічыць аб'ём вытворчасці гэтай прадукцыі: калі ў 1981–1985 гг. у БССР сутачная вытворчасць камбікармоў складала 85 т, то ў 1986–1990 гг. – 3585 т [32, арк. 24] (павялічылася ў 21 раз). Аднак у стойлавы перыяд у шмат якіх гаспадарках кармоў не хапала.

У студзені 1989 г. сакратар Віцебскага абкама КПБ В. Грыгор'еў даслаў у сакратарыят ЦК КПБ ліст, у якім прасіў у першым квартале 1989 г. для ўтрымання дойнага статка выдзеліць вобласці 45 тыс. т камбікорму [33, арк. 3]. У сакавіку 1990 г. у Савет Міністраў БССР звярнуўся старшыня Гродзенскага аблвыканкама Д. Арцыменя, які паведамляў, што ў 1990 г. у вобласці «склалася надзвычай складанае становішча з забеспячэннем свінагадоўчых комплексаў кармамі» [34, арк. 93]. Рашэннем урада 26 сакавіка 1990 г. Гродзенскай вобласці было выдзелена 5 тыс. т камбікорму. Такое ж становішча было і ў іншых абласцях.

Камбікорм гаспадаркі набывалі за кошт крэдытных рэсурсаў; яны былі зацікаўлены ў спісанні крэдыторскай запазычанасці. Пытанне з запазычанасцю калгасаў і саўгасаў у памеры 2538 млн руб. было вырашана 5 чэрвеня 1990 г., калі была прынята Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, у якой было зафіксавана: унесці на разгляд першай сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР дванаццатага склікання праект закона «Аб парадку і тэрмінах спісання даўгоў з калгасаў і саўгасаў у сувязі з пераходам да рыначнай эканомікі» [34, арк. 240–242].

У 1990 г. у БССР становішча з вытворчасцю кармоў заставалася цяжкім: у гэтым годзе калгасамі і саўгасамі было нарыхтавана кармоў уласнай вытворчасці 11,6 млн т карм. адз., што на 1,1 млн т (9 %) менш, чым у 1989 г. У выніку зімовы стойлавы перыяд гаспадаркі пачалі з 77 %-най забяспечанасцю ўласнымі кармамі, а з улікам наяўнасці канцэнтраваных кармоў з урадавага рэзерву – 92 %-най забяспечанасцю да зацверджаных норм [35, арк. 4].

У 1990 г. эканамічнае становішча ў СССР і іншых саюзных рэспубліках пагоршылася. Восенню 1990 г. бюро ЦК КПБ абмеркавала пытанне аб сітуацыі, якая склалася на спажывецкім рынку рэспублікі. У прынятай пастанове было заяўлена, што на рынку харчовых тавараў склалася крызіснае становішча. У сакавіку 1991 г. у сувязі з рэформай розвічных цэн саюзныя рэспублікі ахапіла хваля масавых грамадскіх пратэстаў. У красавіку 1991 г. пленум ЦК КПБ канстатаваў, што забастовачныя выступленні працоўных атрымалі пагрозлівае развіццё, абвастрылі пытанне сацыяльнай падтрымкі дзяржаўнай улады.

## Заключэнне

Такім чынам, аналіз фактычнага матэрыялу паказвае: на працягу 1946–1991 гг. кіраўніцтва Савецкай Беларусі вырашыць праблему забеспячэння жывёлагадоўчай галіны кармамі не здолела. Выкананню пастаноў ЦК КПБ, заданняў мэтавых праграм, скіраваных на вырашэнне кармавой праблемы, перашкаджалі бюракратычныя формы кіравання калгасамі і саўгасамі. Працадзень, які да 1965 г. быў асноўнай формай аплаты працы калгаснікаў, не з'яўляўся інструментам матывацыі сялянства да высокапрадукцыйнай працы. Дзяржава слаба дапамагала калгаснаму кіраўніцтву фінансавымі і матэрыяльнымі рэсурсамі, у выніку чаго кормавытворчасць не была пераведзена на рэйкі інтэнсіфікацыі. Нявырашанасць кармавога пытання прамым чынам адбівалася на ўзмацненні дэфіцыту мяса-малочнай прадукцыі, негатыўна ўплывала на задавальненне спажывецкага попыту, што выклікала пратэсныя акцыі грамадства, падштурхоў-

вала да нарастання агульнага крызісу савецкай сацыяльна-эканамічнай сістэмы і яе краху ў 1990–1991 гг.

Матэрыялы артыкула могуць знайсці прымяненне ў навучальным працэсе пры выкладанні курсаў па гісторыі Беларусі, спецыялізаваных курсаў па аграрнай гісторыі Беларусі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Мн. : Соврем. шк. : Экоперспектива. – Т. 6 : Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.] ; рэд. кал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – 2011. – 727 с.
2. Восьмая сесія Вярхоўнага Савета БССР 9–11 верасня 1946 г. : стэнагр. справаздачs. – Мн. : Дзярж. выд-ва БССР, 1947. – 300 с.
3. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1971) / под общ. ред. П. Н. Федосеева и К. У. Черненко. – Изд. 8. – Т. 6 : 1941–1954. – М. : Политиздат, 1971. – 527 с.
4. Смяховіч, М. У. Аплата працы ў калгасах і саўгасах БССР / М. У. Смяховіч // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2015. – № 3. – С. 50–60.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Воп. 46. Спр. 617.
6. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 4. 1945–1955 / под общ. ред. Г. Г. Бартошевича [и др.]. – Мн. : Беларусь, 1986. – 616 с.
7. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 5. 1956–1965 / под общ. ред. Г. Г. Бартошевича [и др.]. – Мн. : Беларусь, 1986. – 598 с.
8. НАРБ. – Ф. 31. Воп. 6. Спр. 674.
9. Хрушчоў, М. С. Прамова на нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі Беларускай ССР, 22 студзеня 1958 г. / М. С. Хрушчоў. – Мн. : Дзярж. выд-ва БССР, 1958. – 30 с.
10. Хрушчоў, М. С. Кожная рэспубліка павінна ўнесці дастойны ўклад у будаўніцтва камунізму / М. С. Хрушчоў. – Мн. : Дзярж. выд-ва БССР, 1962. – 41 с.
11. Полуян, И. В. Технические кадры белорусской деревни и развитие сельского хозяйства республики / И. В. Полуян. – Мн. : Наука и техника, 1978. – 222 с.
12. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 46. Спр. 822.
13. Хрушчоў, М. С. Паспяхова ажыццяўляць рашэнні лютаўскага пленума ЦК КПСС аб інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці / М. С. Хрушчоў. – Мн. : Беларусь, 1964. – 89 с.
14. НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 2357.
15. Системы ведения сельского хозяйства Белорусской ССР / Н. И. Смеян [и др.]. – Мн. : Урожай, 1981. – 279 с.
16. НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 955.
17. НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 1039.
18. НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 1269.
19. НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 1226.
20. НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 2323.
21. НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 2326.
22. НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 2513.
23. НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 2257.
24. НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 2283.
25. НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 3518.
26. НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 2085.
27. НАРБ. – Ф. 31. Воп. 9. Спр. 4517.
28. НАРБ. – Ф. 31. Воп. 9. Спр. 1368.
29. НАРБ. – Ф. 30. Воп. 13. Спр. 894.
30. Хусаинов, Ю. М. На пути к большому хлебу / Ю. М. Хусаинов. – Мн. : Беларусь, 1985. – 367 с.
31. НАРБ. – Ф. 7. Воп. 10. Спр. 2223.
23. НАРБ. – Ф. 30. Воп.13. Спр. 1622.
33. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 156. Спр. 656.
34. НАРБ. – Ф. 7. Воп. 10. Спр. 2183.
35. НАРБ. – Ф. 31. Воп. 15. Спр. 1860.

REFERENCES

1. Gistoryya Belarusi : u 6 t. – Mn. : Sovrem. shk. : Ekoperspektiva. – T. 6 : Belarus’ u 1946–2009 gg. / L. Lych [i insh.] ; red. kal.: M. Kascyuk (gal. red.) [i insh.]. – 2011. – 727 s.
2. Vos’maya sesiya Vyarkhounaga Saveta BSSR 9–11 verasnya 1946 g. : stenagr. spravazdachy. – Mn. : Dzyarzh. vyd-va BSSR, 1947. – 300 s.
3. Kommunisticheskaya partiya Sovetskogo Soyuza v rezolyuciyah i resheniyah s’ezdov, konferencij i plenumov CK (1898–1971) / pod obshch. red. P. N. Fedoseeva i K. U. Chernenko. – Izd. 8. – T. 6 : 1941–1954. – M. : Politizdat, 1971. – 527 s.
4. Smyahovich, M. U. Aplata pracy u kalgasakh i saugasakh BSSR / M. U. Smyahovich // Vesci NAN Belarusi. Seryya gumanitarnyh navuk. – 2015. – № 3. – S. 50–60.
5. Nacyyanal’ny arkhiu Respubliki Belarus’ (NARB). – F. 4p. Vop. 46. Spr. 617.
6. Kommunisticheskaya partiya Belorussii v rezolyuciyah i resheniyakh s’ezdov i plenumov CK. T. 4. 1945–1955 / pod obshch. red. G. G. Bartoshevicha [i dr.]. – Mn. : Belarus’, 1986. – 616 s.
7. Kommunisticheskaya partiya Belorussii v rezolyuciyah i resheniyakh s’ezdov i plenumov CK. T. 5. 1956–1965 / pod obshch. red. G. G. Bartoshevicha [i dr.]. – Mn. : Belarus’, 1986. – 598 s.
8. NARB. – F. 31. Vop. 6. Spr. 674.
9. Khrushchou, M. S. Pramova na naradze peradavikou sel’skaj gaspadarki Belaruskaj SSR, 22 studzenya 1958 g. / M. S. Khrushchou. – Mn. : Dzyarzh. vyd-va BSSR, 1958. – 30 s.
10. Khrushchou, M. S. Kozhnaya respublika pavinna unesci dastojny uklad u budaunictva kamunizma / M. S. Khrushchou. – Mn. : Dzyarzh. vyd-va BSSR, 1962. – 41 s.
11. Poluyan, I. V. Tekhnicheskie kadry belorusskoj derevni i razvitie sel’skogo khozyajstva respubliki / I. V. Poluyan. – Mn. : Nauka i tekhnika, 1978. – 222 s.
12. NARB. – F. 4p. Vop. 46. Spr. 822.
13. Khrushchou, M. S. Paspyakhova azhyccyaulyac’ rashenni lyutauskaga plenuma CK KPSS ab intensifikacyi sel’skagaspadarchaj vytvorchasci / M. S. Khrushchou. – Mn. : Belarus’, 1964. – 89 s.
14. NARB. – F. 48. Vop. 14. Spr. 2357.
15. Sistemy vedeniya sel’skogo khozyajstva Belorusskoj SSR / N. I. Smeyan [i dr.]. – Mn. : Urozhai, 1981. – 279 s.
16. NARB. – F. 48. Vop. 14. Spr. 955.
17. NARB. – F. 48. Vop. 14. Spr. 1039.
18. NARB. – F. 48. Vop. 14. Spr. 1269.
19. NARB. – F. 48. Vop. 14. Spr. 1226.
20. NARB. – F. 48. Vop. 14. Spr. 2323.
21. NARB. – F. 48. Vop. 14. Spr. 2326.
22. NARB. – F. 48. Vop. 14. Spr. 2513.
23. NARB. – F. 48. Vop. 14. Spr. 2257.
24. NARB. – F. 48. Vop. 14. Spr. 2283.
25. NARB. – F. 48. Vop. 14. Spr. 3518.
26. NARB. – F. 48. Vop. 14. Spr. 2085.
27. NARB. – F. 31. Vop. 9. Spr. 4517.
28. NARB. – F. 31. Vop. 9. Spr. 1368.
29. NARB. – F. 30. Vop. 13. Spr. 894.
30. Khusainov, Yu. M. Na puti k bol’shomu khlebu / Yu. M. Khusainov. – Mn. : Belarus’, 1985. – 367 s.
31. NARB. – F. 7. Vop. 10. Spr. 2223.
23. NARB. – F. 30. Vop.13. Spr. 1622.
33. NARB. – F. 4p. Vop. 156. Spr. 656.
34. NARB. – F. 7. Vop. 10. Spr. 2183.
35. NARB. – F. 31. Vop. 15. Spr. 1860.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 06.03.2026*